**Марыя ТРУХАНОВІЧ,**
*старшы выкладчык*
*кафедры дашкольнай і пачатковай адукацыі*
*Акадэміі паслядыпломнай адукацыі*

# МАДЭЛЬ КІРАВАННЯ ПРАЦЭСАМ АКТУАЛІЗАЦЫІ ГАТОЎНАСЦІ ПЕДАГАГІЧНЫХ РАБОТНІКАЎ ДА НАЦЫЯНАЛЬНА-МОЎНАЙ АДУКАЦЫІ ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ

# MODEL OF MANAGING THE PROCESS OF UPDATING THE READINESS OF EDUCATIONAL WORKERS FOR THE NATIONAL LANGUAGE EDUCATION OF PRESCHOOL CHILDREN

***Анатацыя.*** *У артыкуле прадстаўлена арганізацыйна-кіраўніцкая мадэль актуалізацыі гатоўнасці педагагічных работнікаў да нацыянальна-моўнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту. Раскрыта зместавае напаўненне кожнага блока мадэлі, апісаны кіраўніцкія функцыі і механізмы актуалізацыі названай гатоўнасці.*

***Ключавыя словы:*** *гатоўнасць педагагічных работнікаў, нацыянальна-моўная адукацыя, кіраванне, установа дашкольнай адукацыі.*

***Annotation.*** *The article presents an organizational and managerial model of updating the readiness of teaching staff for the national language education of preschool children. The content content of each block of the model is disclosed, management functions and mechanisms for updating this readiness are described.*

***Keywords:*** *readiness of teaching staff, national language education, management, preschool education institution.*

Забеспячэнне якасці адукацыі дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту — асноўная задача кожнага кіраўніка і педагагічнага работніка ўстановы дашкольнай адукацыі. Згодна з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, якасць адукацыі — гэта адпаведнасць адукацыі патрабаванням адукацыйнага стандарту, вучэбна-праграмнай дакументацыі, іншым патрабаванням, прадугледжаным актамі заканадаўства [4]. Паводле вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, кіраўнікі ўстаноў дашкольнай адукацыі абавязаны ствараць умовы для забеспячэння якасці адукацыі, у тым ліку нацыянальна-моўнай, якая рэалізуецца ў першую чаргу праз вырашэнне задач адукацыйнай галіны «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін», як у групах з беларускай, так і з рускай мовамі навучання і выхавання. Вучонымі (Д.М. Дубінінай і Н.С. Старжынскай) нацыянальна-моўная адукацыя вызначаецца як моўная адукацыя на роднай мове, у працэсе якой дзіця дашкольнага ўзросту ўваходзіць у родную нацыянальную моўную культуру, у яе прастору, якая складаецца падчас змястоўнага суразмоўніцтва на беларускай мове [2; 3]. Калі размова ідзе аб моўнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту — гатоўнасць педагагічнага работніка да гэтай дзейнасці становіцца асноўнай умовай забеспячэння яе якасці, тым больш у сітуацыі білінгвальнага навучання. Паспяховая рэалізацыя дзейнасці, эфектыўнае адміністраванне наўпрост залежаць ад якасці чалавечых рэсурсаў у арганізацыі, у тым ліку ўстаноў дашкольнай адукацыі, атмасферы ўнутры яе, ступені адданасці педагагічных работнікаў сваёй справе.

Вучонымі мінулага і сучаснасці надавалася і надаецца вялікая ўвага маўленню педагагічнага работніка як сродку маўленчага развіцця дзяцей (І.А. Зімняя, Якуб Колас,

У.А. Круцецкі, В.Р. Кастамараў, А.А. Лявонцьеў, В.П. Протчанка, Н.С. Старжынская, К.Д. Ушынскі і інш.). Менавіта таму праблема гатоўнасці педагагічных работнікаў да моўнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту знаходзіцца заўсёды ў цэнтры ўвагі і патрабуе пастаяннага пошуку новых падыходаў да яе вырашэння, тым больш у сітуацыі дзяржаўнага білінгвізму. Кампанентамі гатоўнасці педагагічных работнікаў да нацыянальна-моўнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту (далей — ГПНМА) з'яўляюцца наступныя кампетэнцыі: лінгвістычная, камунікатыўная, лінгвадыдактычная, этнакультурная, матывацыйна-каштоўнасная накіраванасць на нацыянальна-моўную адукацыю. Дастатковы ўзровень развіцця вызначаных кампетэнцый неабходны кожнаму педагагічнаму работніку для забеспячэння паспяховасці вырашэння адукацыйных задач нацыянальна-моўнай адукацыі дзяцей (далей — НМА).

Разам з тым, актуальная сітуацыя ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, характарызуецца тым, што большасць кіраўнікоў маюць відавочныя праблемы пры кіраванні працэсам выкарыстання нацыянальнай мовы ў дзейнасці ўстаноў. Гэтыя праблемы, перш за ўсё, звязаны з забеспячэннем ГПНМА. Сфарміраваныя ў педагагічных работнікаў падчас атрымання прафесійнай адукацыі кампетэнцыі, неабходныя для ажыццяўлення нацыянальна-моўнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту, паступова страчваюць свой актуалізаваны стан па шэрагу прычын, да якіх, перш за ўсё, неабходна аднесці неактыўнае выкарыстанне беларускай мовы як у асабістым жыцці, так і ў прафесійнай дзейнасці. Аб гэтым сведчаць вынікі праведзенага намі ў 2019–2021 гадах пілотнага даследавання метадам апытання загадчыкаў і намеснікаў загадчыка па асноўнай дзейнасці ўстаноў дашкольнай адукацыі. Паводле апытання, у якім прынялі ўдзел 552 рэспандэнты, толькі 21,1% кіраўнікоў адзначылі, што дастатковы ўзровень валодання нацыянальнай мовай для забеспячэння якасці адукацыйнага працэсу ўласцівы ўсім педагагічным работнікам установы дашкольнай адукацыі, дзе яны працуюць. Частка апытаных кіраўнікоў (36,5%) адказала, што больш за палову педагагічных работнікаў ва ўстановах дашкольнай адукацыі, дзе яны кіруюць, валодаюць беларускай мовай на дастатковым узроўні для ажыццяўлення адукацыйных зносін з выхаванцамі. Разам з тым, значная частка апытаных кіраўнікоў (37,8%) адзначылі, што ва ўстановах адукацыі такіх педагагічных работнікаў менш за палову ці ўвогуле няма (4,6 %). Кіраўнікі, з аднаго боку, разумеюць наяўнасць праблем у выкарыстанні нацыянальнай мовы ва ўстановах дашкольнай адукацыі, з другога — не заўсёды валодаюць інфармацыяй, як на гэта паўплываць [15, с. 17–19]. У выніку на момант завяршэння атрымання дзецьмі дашкольнай адукацыі ў шэрагу ўстаноў дашкольнай адукацыі немагчыма забяспечыць патрабаваны ўзровень падрыхтоўкі выхаванцаў па адукацыйнай галіне «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін» як у групах з беларускай, так і ў групах з рускай мовамі навучання і выхавання.

Пры разглядзе кіравання як «дзейнасці над дзейнасцю» становіцца відавочнай узаемазалежнасць якасці іх рэалізацыі [16]. Каб мець магчымасць кіраваць якой-небудзь дзейнасцю, перш за ўсё, неабходна вылучыць яе нарматыўна-лагічную структуру. Разам з тым, у працэсе нашага даследавання была зроблена выснова, што значная частка кіраўнікоў знаходзіцца на ўзроўні павярхоўнага, інтуітыўнага адчування праблемы ў ажыццяўленні НМА, а не глыбіннага яе разумення, і адпаведна, не маюць кіраўніцкага бачання шляхоў яе вырашэння, і таму ім цяжка вылучыць структуру дзейнасці. Відавочна неабходнасць пошуку выйсця з дадзенага становішча праз распрацоўкі ўніверсальных механізмаў кіравання актуалізацыяй ГПНМА. Адным са шляхоў вырашэння выяўленай праблемы можа быць распрацоўка арганізацыйна-кіраўніцкай мадэлі актуалізацыі ГПНМА.

Мадэляванне выкарыстоўваецца ў якасці ўніверсальнага метаду навуковага пазнання, пры недастатковасці тэарэтычных ведаў і практычнага досведу [7, с. 335–336]. Мэта мадэлявання ў абраным напрамку прадугледжвае распрацоўку мадэлі арганізацыйна-кіраўніцкай дзейнасці, якая забяспечыць пазітыўную дынаміку актуалізацыі ГПНМА, кожнай уключанай у яе кампетэнцыі. Такім чынам, аб'ектам мадэлявання выступае кіраўніцкая дзейнасць па актуалізацыі ГПНМА. У абагульненым выглядзе кіраванне ўстановай дашкольнай адукацыі можна вызначыць як мэтанакіраванае ўздзеянне кіраўніка

на педагагічны калектыў, а праз яго — на адукацыйны працэс для дасягнення аптымальных вынікаў у выхаванні, развіцці, навучанні дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту (К.Ю. Белая, Л.М. Дзенякіна, Л.В. Пазняк і інш.). Л.Г. Тарусава вызначае паняцце «кіраванне ўстановай дашкольнай адукацыі» як сукупнасць працэсаў, якія забяспечваюць падтрымку сістэмы ў пэўным стане ці перавод яе ў новы, больш эфектыўны стан сродкамі распрацоўкі і рэалізацыі мэтанакіраваных уздзеянняў. Наяўнасць эфектыўнай сістэмы кіравання з'яўляецца фактарам прадуктыўнай дзейнасці супрацоўнікаў, іх самаразвіцця і самарэалізацыі [13, с. 12]. Такім чынам, кіраванне актуалізацыяй ГПНМА можна вызначыць як мэтанакіраваную сістэмную дзейнасць кіраўнікоў па забеспячэнні актуалізацыі кампетэнцый педагагічных работнікаў, неабходных для якаснага вырашэння імі задач нацыянальна-моўнай адукацыі дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту.

Метадалагічнай асновай пабудовы арганізацыйна-кіраўніцкай мадэлі актуалізацыі ГПНМА намі была абраная канцэпцыя развіццёвага кіравання, падставай якой выступае тэхналогія кіравання педагагічнымі сістэмамі па выніках (П.І. Траццякоў, Т.І. Шамава). У дачыненні да кіравання ўстановай дашкольнай адукацыі К.Ю. Белая і П.І. Траццякоў вызначаюць развіццёвае кіраванне як сістэму кіравання і развіцця ўстановы дашкольнай адукацыі, з дапамогай якой дасягаюцца вынікі, узгодненыя і вызначаныя з кожным педагагічным работнікам. Кіраванне па выніках — мэтанакіраванае, рэсурсна забяспечанае ўзаемадзеянне кіраўніцкай і кіруемай сістэм па дасягненні работнікамі спрагназаванага выніку [14, с. 22–26]. У нашым выпадку вынікам з'яўляецца пазітыўная дынаміка актуалізацыі ГПНМА як асобнага педагагічнага работніка, так і ўсяго калектыву, з арыентацый на павышэнне якасці НМА дзяцей дашкольнага ўзросту.

Аналіз прадстаўленых у розных навуковых даследаваннях мадэлей прафесійнага развіцця педагагічных работнікаў (А.В. Бэкман [1], В.Л. Жук [3], В.М. Макарава [8] і інш.) дазволіў пераканацца ў тым, што такім мадэлям звычайна ўласціва блокавая пабудова, структурнай адзінкай якой з'яўляецца модуль — гіпатэтычны тэарэтычны канструкт, які адлюстроўвае субстанцыйнасць, самастойнасць, суразмернасць праектаванай падсістэмы. На гэтай аснове намі вызначана структура арганізацыйна-кіраўніцкай мадэлі актуалізацыі ГПНМА дзяцей дашкольнага ўзросту, якая складаецца з 5 блокаў: мэтавы, канцэптуальны, змestава-працэсуальны, тэхналагічны, рэгулятыўна-ацэначны.

*Мэтавы блок*. Вызначае мэту кіраўніцкай дзейнасці па рэалізацыі распрацаванай намі мадэлі і задачы, накіраваныя на яе дасягненне. Мэта кіраўніцкай дзейнасці — забеспячэнне актуалізацыі ГПНМА дзяцей дашкольнага ўзросту. Выяўленасць і глыбіня працэсу актуалізацыі залежаць ад зыходнага ўзроўню ГПНМА кожнага педагагічнага работніка.

*Канцэптуальны блок*. Уяўляе тэарэтычны падмурак арганізацыйна-кіраўніцкай дзейнасці і ўключае падыходы і прынцыпы да актуалізацыі ГПНМА. Аналіз навуковых крыніц (У.А. Белікаў, В.Л. Жук, В.М. Макарава, І.П. Падласы, А.В. Хутарскі і інш.) дазволіў вызначыцца ў тым, што працэс актуалізацыі ГПНМА павінен будавацца на комплексным, працэсуальным, дзейнасным і кампетэнтнасным падыходах. Прынцыпы пабудовы работы па актуалізацыі ГПНМА былі абраныя шляхам аналізу і суаднясення прынцыпаў андрагогікі, прадстаўленых у навуковай літаратуры (А.І. Кукуеў, М.Ш. Ноулз, В.А. Суйкова і інш.), з мэтай і задачамі мадэлі, узгодненыя з асаблівасцямі кіравання ва ўстанове дашкольнай адукацыі. У вызначаны блок былі ўключаны прынцыпы: індывідуалізацыі навучання, рэфлексіўнасці, прыярытэтнасці самастойнага навучання, эфектыўнасці навучання, запатрабаванасці вынікаў навучання ў непасрэднай дзейнасці, карэкціроўкі ўстарэлага вопыту і асобасных установак, сістэмнасці навучання, развіцця навучэнца, прыярытэту практыка-арыентаваных форм і метадаў навучання і сумеснай дзейнасці кіраўніка і педагагічных работнікаў. Уся дзейнасць па рэалізацыі мадэлі павінна ажыццяўляцца ў адпаведнасці з абранымі падыходамі на падставе вызначаных прынцыпаў. Яны выступаюць метадалагічнай асновай рэалізацыі арганізацыйна-кіраўніцкай дзейнасці па актуалізацыі ГПНМА.

*Змestава-працэсуальны блок*. Змест блока, па-першае, уключае нарматыўна-функцыянальны вобраз педагагічнага работніка з дастатковым узроўнем ГПНМА як арыенцір кіраўніцкай дзейнасці. Гэты ўзровень дазваляе педагагічнаму работніку

якасна вырашаць задачы НМА дзяцей дашкольнага ўзросту і з'яўляецца асновай для пабудовы працэсу кіравання актуалізацыяй ГПНМА.

Па-другое, у ім прадстаўлена непасрэдна арганізацыйна-кіраўніцкая дзейнасць па актуалізацыі ГПНМА згодна з функцыянальным падыходам, прапанаваным П.І. Трацьяковым. Адпаведна вызначанаму падыходу, кіраванне ўстановай адукацыі ўяўляе сукупнасць функцый кіравання, пад якімі маюцца на ўвазе бесперапынныя і ўзаемазвязаныя віды дзейнасці. Кожная функцыя, у сваю чаргу, таксама разглядаецца як працэс, які складаецца з узаемазвязаных дзеянняў і аперацый [16]. Намі былі вызначаны функцыі кіравання, рэалізацыя якіх дазволіць дасягнуць пастаўленай мэты:

- інфармацыйна-аналітычная функцыя, накіравана на аналіз актуальнага стану ГПНМА і выбар найбольш мэтазгодных шляхоў, метадаў і форм, актуалізацыі як у дачыненні да кожнага асобнага педагагічнага работніка, так і да педагагічнага калектыву цалкам, з улікам агульных праблем;

- планава-прагнастычная функцыя забяспечвае спалучэнне перспектыўнага прагназавання працэсаў актуалізацыі ГПНМА і бягучага планавання дзейнасці і прадугледжвае канкрэтызацыю і карэкціроўку мерапрыемстваў;

- арганізацыйна-выканальніцкая функцыя, якая, у першую чаргу, звязана з забеспячэннем прынцыпу індывідуальнага падыходу да працэсу актуалізацыі ГПНМА кожнага педагагічнага работніка праз вызначэнне яго непасрэдных абавязкаў і абумоўленай імі дзейнасці. Гэта функцыя апасродкавана акрэслівае зону адказнасці за вынік, які атрымае кожны работнік асобна і зможа дасягнуць калектыў цалкам. Значнае месца тут займае пераемнасць дзеянняў кіраўніка і самакіравання педагагічных работнікаў працэсам свайго прафесійнага самаразвіцця;

- матывацыйна-мэтавая функцыя, звязана з агульнай накіраванасцю педагагічнага калектыву на актуалізацыю ГПНМА, якая дасягаецца з дапамогай розных форм і метадаў кіравання ведамі і каштоўнаснымі арыенцірамі ўсіх педагагічных работнікаў. Асноўная мэта дадзенай функцыі — праз развіццё каштоўнаснага стаўлення да НМА сфарміраваць агульную мэтавую накіраванасць педагагічных работнікаў на неабходнасць удасканалення сваіх кампетэнцый для ажыццяўлення вызначанай дзейнасці;

- кантрольна-дыягнастычная функцыя прадугледжвае ажыццяўленне маніторынгу і кантролю для ацэнкі актуальнага стану ГПНМА, змен, якія ў ёй адбываюцца, і адпаведна, эфектыўнасці кіраўніцкага ўздзеяння;

- рэгулятыўна-карэкцыйная функцыя, звязана са своечасовым унясеннем змен у працэс кіравання актуалізацыяй ГПНМА, прыняццем кіраўніцкіх рашэнняў, якія ажыццяўляюцца на аснове канкрэтызацыі задач, паэтапнага прагназавання вынікаў, вызначэннем мэтазгодных сродкаў і спосабаў дзейнасці. Дадзеная дзейнасць ажыццяўляецца на аснове ўдакладнення вынікаў, вылучэння і ўзгаднення магчымых варыянтаў рашэння і выбару з дапамогай ацэнкі канчатковага рашэння па кіраванні актуалізацыяй ГПНМА.

Такім чынам, у змястава-працэсуальны блок увайшлі функцыі кіравання, якія рэалізуюцца сродкамі кіраўніцкіх механізмаў праз сукупнасць мерапрыемстваў, метадаў і ўмоў ва ўстанове дашкольнай адукацыі. Па вызначэнні Н.І. Коркінай, механізм кіравання ў адукацыі ўяўляе сабой сістэму форм, сродкаў, метадаў, працэдур, рэсурсаў, якія ўзгоднена разгортваюцца ў прасторы і часе для вырашэння пэўных задач кіравання. Механізм ёсць сродак рэалізацыі функцыі кіравання [6, с. 16].

Для рэалізацыі мадэлі вызначаны наступныя механізмы кіравання: забеспячэнне пастаянных інфармацыйных патокаў паміж кіруемай і кіраўніцкай сістэмамі; кіраванне ведамі педагагічных работнікаў з мэтай актуалізацыі кампетэнцый ГПНМА; стварэнне ўмоў для фарміравання матывацыйна-каштоўнаснай накіраванасці педагагічных работнікаў да НМА дзяцей дашкольнага ўзросту; рэалізацыя маніторынгу якасці НМА дзяцей дашкольнага ўзросту. Раскрыем кожны механізм паасобку.

Забеспячэнне пастаянных інфармацыйных патокаў паміж кіруемай і кіраўніцкай сістэмамі аб задачах, працэсах і выніках НМА як асноўных арыенцірах дзейнасці. Кіраванне ў адукацыі прадугледжвае забеспячэнне ўсіх суб'ектаў інфармацыяй аб дзейнасці сістэмы. На аснове інфармацыі ажыццяўляецца прыняцце рашэнняў, а таксама планаванне дзейнасці. Такім чынам, адным з механізмаў кіравання з'яўляецца забеспячэнне пастаянных інфармацыйных патокаў паміж кіруемай і кіраўніцкай сістэмамі

(з вонкавых і ўнутраных крыніц) аб задачах, працэсах і выніках НМА і ўзгодненых з імі патрабаванняў да ГПНМА. Да вонкавай інфармацыі адносяцца нарматыўныя прававыя акты і навукова-метадычнае забеспячэнне, якія рэгулююць арганізацыю НМА ў сістэме дашкольнай адукацыі, тэарэтычныя асновы і методыка маўленчага развіцця, уключаючы перадавы педагагічны вопыт і іншыя крыніцы, звязаныя з арганізацыяй адукацыйнага працэсу і выкарыстаннем нацыянальнай мовы ў дзейнасці ўстановы дашкольнай адукацыі. Унутраная інфармацыя ўключае звесткі аб функцыянаванні ўстановы адукацыі, аб наяўнай якасці НМА і, у першую чаргу, аб актуальным стане ГПНМА і зменах, якія будуць адбывацца пад уплывам кіраўніцкага ўздзеяння.

Для забеспячэння патокаў бягучай і выніковай інфармацыі намі была абрана логіка-храналагічная паслядоўнасць інфармацыйнага працэсу, прапанаваная А.С. Камаровай, якая ўяўляе наступны цыклічны алгарытм: збор бягучай інфармацыі — аналіз інфармацыі — распрацоўка рашэнняў — збор інфармацыі аб іх выкананні — ацэнка выканання — захаванне інфармацыі [5, с. 13–14]. Такі алгарытм дазваляе на аснове атрымання эфектыўнай зваротнай сувязі паміж кіраўніцкай і кіруемай сістэмамі абіраць адэкватныя мерапрыемствы прагназавання і рэгулявання, удасканалення працэсу актуалізацыі ГПНМА.

Кіраванне ведамі педагагічных работнікаў з мэтай актуалізацыі кампетэнцый ГПНМА. Гэты механізм кіравання рэалізуецца праз мэтанакіраванае метадычнае суправаджэнне, што ажыццяўляецца ў розных формах. Метадычнае суправаджэнне прадугледжвае сістэмнае развіццё ў педагагічных работнікаў тэарэтычных і практычных ведаў, уменняў, адпаведных кожнай з кампетэнцый ГПНМА. Як адзначае В.Ф. Русецкі, пабудова любой метадычнай сістэмы магчыма толькі на аснове двух зыходных палажэнняў: па-першае, патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да ўзроўню гатоўнасці навучэнца; па-другое, рэальнага стану гатоўнасці перад пачаткам навучання [12, с. 104]. У нашым даследаванні зыходнымі палажэннямі выступае актуальны стан ГПНМА. Патрабаванні да ГПНМА складаюць нарматыўна-функцыянальны вобраз педагагічнага работніка з дастатковым узроўнем ГПНМА, які прадстаўлены ў зместава-працэсуальным блоку мадэлі.

Метадычнае суправаджэнне кіравання ведамі педагагічных работнікаў уключае: мерапрыемствы метадычнай работы, накіраваныя на актуалізацыю кожнай з кампетэнцый ГПНМА; кіраванне працэсам самаадукацыі педагагічных работнікаў; рэсурснае забеспячэнне працэсу самаадукацыі. Арганізацыя метадычнага суправаджэння ажыццяўляецца на аснове прынцыпу індывідуалізацыі навучання, у залежнасці ад пасад педагагічных работнікаў, а таксама мовы навучання і выхавання ў групах, дзе яны працуюць. Вызначаны прынцып рэалізуецца ў змястоўным і тэхналагічным кампанентах метадычных мерапрыемстваў, працэсе кіравання самаадукацыяй, рознабаковым рэсурсным забеспячэнні. Метадычныя мерапрыемствы для педагагічных работнікаў распрацаваны на аснове падыходаў і прынцыпаў актуалізацыі ГПНМА (кожнай кампетэнцыі) і прадстаўлены практыка-арыентаванымі формамі (семінары-практыкумы, дзелавыя гульні і інш.).

Самаадукацыя педагагічных работнікаў ажыццяўляецца на аснове развіцця здольнасцей да рэфлексіі працэсу НМА дзяцей дашкольнага ўзросту, праектавання ўласнай траекторыі прафесійнага самаразвіцця. Алгарытм самаадукацыі ўяўляе шматступенны аналітычны працэс асэнсавання педагагічным работнікам свайго прафесійнага вопыту, заснаванага на самакантролі, самадыягностыцы, усведамленні цяжкасцей і вызначэнні далейшых перспектыў самаўдасканалення з мадэляваннем працэсу і падтрымкі ў актуальным стане сваёй гатоўнасці да НМА. Для павышэння прафесійнай кампетэнтнасці педагагічных работнікаў у галіне НМА дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту, у першую чаргу, шляхам самаадукацыі, намі быў створаны віртуальны метадычны кабінет. Асноўная мэта распрацаванага рэсурсу — гэта бесперапыннае інфармацыйна-метадычнае суправаджэнне адукацыйнай дзейнасці педагагічных работнікаў у напрамку НМА, як нарматыўнай прававой, так і навукова-метадычнай, удасканаленне спосабаў узаемадзеяння метадычнай службы і педагагічных работнікаў у рамках арганізацыі метадычнага суправаджэння.

Метадычная дзейнасць у распрацаванай мадэлі непасрэдна звязана са стымуляваннем педагагічных работнікаў да ажыццяўлення якаснай НМА, таму апісаны механізм непасрэдна звязаны са стварэннем умоў для

фарміравання матывацыйна-каштоўнаснай накіраванасці педагагічных работнікаў на НМА дзяцей дашкольнага ўзросту. Вызначаны механізм, у першую чаргу, прадугледжвае актуалізацыю ведаў педагагічных работнікаў аб сваіх прафесійных абавязках па стварэнні ўмоў для якаснай НМА дзяцей дашкольнага ўзросту, сваёй ролі ў дадзеным працэсе. Адзначаныя веды з'яўляюцца асновай усведамлення неабходнасці валодання педагагічнымі работнікамі нацыянальнай мовай для якаснага выканання прафесійных задач. Па-другое, уключае стварэнне ўмоў для ўсведамлення педагагічнымі работнікамі ўсіх пераваг і магчымасцей, якія дае білінгвальнае навучанне і выхаванне з мэтай рознабаковага развіцця дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту. Гэта будзе стымуляваць педагагічных работнікаў да выкарыстання ў адукацыйным працэсе эфектыўных метадаў маўленчага і лінгвістычнага развіцця выхаванцаў у сітуацыі руска-беларускага двухмоўя на падставе ўпэўненасці ў тым, што засваенне дзвюх дзяржаўных моў дазваляе больш глыбока развіваць здольнасці выхаванцаў у розных напрамках.

Фарміраванне матывацыі на дзейнасць непасрэдна звязана з яе ацэнкай, таму вызначаныя механізмы знаходзяцца ва ўзаемазалежнасці ад рэалізацыі маніторынгу якасці НМА дзяцей дашкольнага ўзросту. Шэраг вучоных (К.Ю. Белая, Н.Р. Дубешка, Д.А. Новікаў і інш.) лічаць маніторынг адным з асноўных інструментаў кіравання якасцю адукацыі. Як адзначае Д.А. Новікаў, маніторынг і аналіз бягучага стану адукацыйнай сістэмы неабходны для атрымання той «кропкі адліку», адносна якой будзе ацэньвацца развіццё адукацыйнай сістэмы з улікам кіраўніцкіх уздзеянняў. Параўнанне бягучага стану адукацыйнай сістэмы з уяўленнямі, якія адлюстроўваюць яе «ідэальны стан», дазваляюць у першым набліжэнні ацэньваць бягучую эфектыўнасць яе функцыянавання [9, с. 24]. Вынікі маніторынгу, на думку Н.Р. Дубешка, дазваляюць апісаць рэалізацыю функцый кіравання якасцю адукацыі ў адзіным кіраўніцкім цыкле. Ахоп маніторынгам усіх функцый кіравання дапамагае вызначыць вонкавыя і ўнутраныя фактары, якія паўплываюць на дынаміку аб'екта і прадмета даследавання, правільна ацаніць выразнасць і накіраванасць адхіленняў ад пастаўленай мэты, абраных задач [2, с. 10–11].

Аб'ектамі маніторынгу выступаюць, у першую чаргу, якасць чалавечых рэсурсаў, актуальны стан кампетэнцый ГПНМА. Маніторынг якасці НМА прадугледжвае назіранне за рэалізацыяй задач па адукацыйных галінах «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін» і «Мастацкая літаратура» з дапамогай педагагічнай дыягностыкі. Педагагічная дыягностыка — гэта сістэма дзейнасці педагагічных работнікаў, накіраваная на індывідуалізацыю навучання і выхавання дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту, вызначэнне дынамікі іх развіцця, дазваляе ўносіць карэктывы ў адукацыйны працэс у мэтах павышэння яго якасці [11, с. 35]. Маніторынг вынікаў НМА ўключае збор і аналіз інфармацыі аб засваенні зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі выхаванцамі кожнай узроставай групы. Выкананне патрабаванняў адукацыйнага стандарту дашкольнай адукацыі да засваення зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі выхаванцамі выступае індыкатарам ГПНМА. Для педагагічнага работніка інфармацыя аб паспяховасці дадзенай дзейнасці, выяўленне праблем у ёй — гэта аснова пабудовы адукацыйнага працэсу ўвогуле і свайго прафесійнага развіцця ў прыватнасці. Для кіраўніка ўстановы адукацыя — гэта крыніца інфармацыі, неабходная для каардынацыі ўсёй дзейнасці, падстава для планавання кіравання ведамі педагагічных работнікаў.

Інструментам, які дапамагае сістэмна атрымаць аб'ектыўную інфармацыю аб тым, наколькі адпавядае патрабаванням працэс рэалізацыі НМА ў пэўнай установе дашкольнай адукацыі, з'яўляецца кантроль. Асноўным аб'ектам кантролю, які ўключае шматлікую колькасць кампанентаў, з'яўляецца непасрэдна сам адукацыйны працэс, накіраваны на маўленчае і лінгвістычнае развіццё выхаванцаў на нацыянальнай мове. Перш за ўсё, аб'ектамі кантролю з'яўляюцца: спецыяльна арганізаваная дзейнасць па адукацыйных галінах «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін» і «Мастацкая літаратура»; штодзённая нерэгламентаваная дзейнасць, у тым ліку падчас правядзення тэматычных дзён на беларускай мове. Асобным аб'ектам кантролю з'яўляецца ўжыванне беларускай мовы ў дзейнасці педагагічных работнікаў з выхаванцамі і іншымі суб'ектамі адукацыйных зносін.

Вынікі маніторынгу, узгодненыя з вынікамі кантролю, выступаюць інфармацыйнымі крыніцамі аб дынаміцы актуалізацыі ГПНМА і асновай для пабудовы кіраўніцкіх дзеянняў. Прыняцце кіраўніцкіх рашэнняў па павышэнні якасці адукацыі на аснове вынікаў маніторынгу ажыццяўляецца ў кожнай з функцый кіравання.

Усе вызначаныя механізмы з'яўляюцца ўзаемазалежнымі. Адсутнасць аднаго будзе адмоўна ўплываць на эфектыўнасць астатніх. Неабходна падкрэсліць, што кожны механізм рэалізуецца на аснове выкарыстання ўсіх функцый кіравання, якія забяспечваюць яго эфектыўнасць.

*Тэхналагічны блок*. Вызначаны блок змяшчае прыкладны план рэалізацыі мерапрыемстваў арганізацыйна-кіраўніцкай дзейнасці па актуалізацыі ГПНМА. Да плану намі распрацаваны рэкамендацыі, у якіх апісваюцца і тлумачацца алгарытмы дзейнасці кіраўнікоў па яе рэалізацыі. У адпаведнасці з планам распрацаваны: мерапрыемствы метадычнага суправаджэння актуалізацыі ГПНМА (формы метадычнай работы з іх рэсурсным забеспячэннем, арганізацыйна-метадычныя парады і тэмы для самаадукацыі педагагічных работнікаў, прыклады заданняў для самастойнай работы і інш.), інструментарый для ажыццяўлення кантрольна-дыягнастычнай функцыі кіравання (маніторынг якасці нацыянальна-моўнай адукацыі (бланкі педагагічнага назірання, кантролю ажыццяўлення нацыянальна-моўнай адукацыі і інш.)), электронныя рэсурсы (віртуальны метадычны кабінет «Родная беларуская мова», мультымедыйныя прэзентацыі, інтэрактыўныя гульні і практыкаванні, распрацаваныя з дапамогай віртуальных сэрвісаў).

*Рэгулятыўна-ацэначны блок*. Па сутнасці вызначаны блок з'яўляецца прамежкавым, выніковым. Дадзены блок змяшчае інструментарый для ацэнкі эфектыўнасці распрацаванай мадэлі, якая вызначаецца шляхам выяўлення дынамікі актуалізаванасці капетэнцый ГПНМА ў параўнанні з першапачатковымі вынікамі. Зыходзячы з патрабаванняў комплекснага і кампетэнтнаснага падыходаў, вынікі вызначаюцца ў абагульненым выглядзе як адпаведнасць крытэрыям і паказчыкам ГПНМА. Пры ажыццяўленні аналізу ўлічваецца, што актуалізацыя кампетэнцый адбываецца паступова і неабавязкова аднастайна ў дачыненні да кожнай. Адносна ўстановы адукацыі ўвогуле і педагагічнага работніка ў прыватнасці працэс актуалізацыі ГПНМА мае свае асаблівасці і па змесце, і па працягласці ў залежнасці ад першапачатковага стану ГПНМА. Разам з тым, менавіта пазітыўная дынаміка сведчыць аб эфектыўнасці арганізацыйна-кіраўніцкай мадэлі. Вызначаныя дадзеныя з'яўляюцца асновай для карэкцыі дзейнасці і планавання новых мерапрыемстваў па актуалізацыі ГПНМА.

Апошні блок змяшчае дадатковыя індыкатары эфектыўнасці рэалізацыі мадэлі, да якіх адносяцца: актывізацыя выкарыстання педагагічнымі работнікамі беларускай мовы ў прафесійнай дзейнасці (з рознымі суб'ектамі адукацыйных зносін пры вырашэнні разнастайных адукацыйных задач); фарміраванне ўсведамлення аб неабходнасці валодання беларускай мовай для прафесійнай дзейнасці; павышэнне актыўнасці працэсу самаадукацыі педагагічных работнікаў, звязанай з узмацненнем матывацыі да самаўдасканалення кампетэнцый ГПНМА і інш.

Распрацаваная арганізацыйна-кіраўніцкая мадэль была апрабавана ў дзейнасці ўстаноў дашкольнай адукацыі розных рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь. У апрабацыі прынялі ўдзел 75 педагагічных работнікаў. Вызначаная пазітыўная дынаміка актуалізацыі кампетэнцый ГПНМА педагагічных работнікаў у выніку выкарыстання мадэлі сведчыць аб мэтазгоднасці яе ўжывання. Суадносенне атрыманых вынікаў з індыкатарамі эфектыўнасці таксама дэманструе наяўнасць пазітыўнага ўплыву распрацаванай арганізацыйна-кіраўніцкай мадэлі на працэс выкарыстання нацыянальнай мовы ў дзейнасці ўстановы дашкольнай адукацыі і актывізацыю працэсу самаўдасканалення педагагічных работнікаў у напрамку нацыянальна-моўнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту. У працэсе апрабацыі была зроблена выснова аб тым, што распрацаваная мадэль з'яўляецца ўніверсальнай адносна любога віду ўстановы дашкольнай адукацыі, незалежна ад асабістых характарыстык, і можа выступаць алгарытмам кіравання якасцю НМА ў частцы забеспячэння гатоўнасці да дзейнасці асноўнага рэсурсу — педагагічных работнікаў.

Прапанаваная арганізацыйна-кіраўніцкая мадэль актуалізацыі ГПНМА прыдатная для практычнага выкарыстання ў дзейнасці ўстановы дашкольнай адукацыі. Пералічаныя блокі арганізацыйна-кіраўніцкай мадэлі актуалізацыі ГПНМА дзяцей дашкольнага ўзросту ўзаемазвязаны паміж сабою і з'яўляюцца ўзаемаабумоўленымі. Усе ўключаныя структурныя элементы арганізацыйна-кіраўніцкай мадэлі выступаюць ва ўзаемасувязі блокаў у цэлым і іх кампанентаў. Такім чынам, забяспечваецца пераемнасць кіраўніцкіх функцый і дзеянняў для дасягнення пастаўленай мэты. Сістэмная дэтэрмінаванасць усіх структурных блокаў распрацаванай мадэлі забяспечвае яе арганізацыйна-канцэптуальную цэласнасць, што выступае важнай умовай яе ўкаранення ў кіраўніцкі працэс.

Усе ўключаныя механізмы кіравання, мерапрыемствы, алгарытмы і метады даступны і дапускаюць магчымасць варыятыўнасці іх выкарыстання (паслядоўнасці) з улікам патрэб кожнай асобнай установы адукацыі пры захаванні асноўнай структуры.

Мяркуецца, што выкарыстанне распрацаванай арганізацыйна-кіраўніцкай мадэлі дапаможа кіраўнікам устаноў дашкольнай адукацыі стварыць умовы для забеспячэння ГПНМА, што будзе спрыяць павышэнню якасці нацыянальна-моўнай і білінгвальнай адукацыі дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 11.05.2023 г.*

ЛІТАРАТУРА:

1. Бэкман, Е. В. Эвристический диалог как средство развития коммуникативной компетенции иностранных студентов при обучении русскому языку : дис. ... канд. пед. наук : 13.00.01 ; 13.00.02 / Е. В. Бэкман ; Гродн. гос. ун-т им. Я. Купалы, Нац. ин-т образования. — Минск, 2018. — 332 л.

2. Дубешко, Н. Г. Управление качеством дошкольного образования в учреждении / Н. Г. Дубешко // Кіраванне ў адукацыі. — 2012. — № 8. — С. 10–16.

3. Жук, О. Л. Педагогическая подготовка студентов: компетентностный подход / О. Л. Жук. — Минск : РИВШ, 2009. — 336 с.

4. Кодекс Республики Беларусь об образовании : по состоянию на 1 сент. 2022 г. — Минск : Национальный центр правовой информации Республики Беларусь, 2022. — 512 с.

5. Комарова, А. С. Условия совершенствования системы информационного обеспечения управления дошкольным образованием: на муниципальном уровне : автореф. дис. ... канд. пед. наук : 13.00.01 ; 13.00.07 / А. С. Комарова ; Магнитог. гос. ун-т. — Магнитогорск, 2000. — 19 с.

6. Коркина, Н. И. Принципы и механизмы совершенствования управления общим образованием: региональный аспект : автореф. дис. ... канд. пед. наук : 13.00.01 / Н. И. Коркина ; Курган. гос. ун-т, Челяб. гос. ун-т. — Курган, 2004. — 22 с.

7. Краевский, В. В. Методология педагогики: новый этап : учеб. пособие для студентов высш. учеб. заведений / В. В. Краевский, Е. В. Бережнова. — М. : Академия, 2006. — 400 с.

8. Макарова, В. Н. Подготовка педагогов к речевому и лингвистическому развитию детей дошкольного возраста в системе непрерывного профессионального образования : автореф. дис. ... д-ра пед. наук : 13.00.08 / В. Н. Макарова ; Орлов. гос. ун-т. — Орел, 2011. — 44 с.

9. Новиков, Д. А. Теория управления образовательными системами : учеб.-метод. пособие / Д. А. Новиков. — М. : Народное образование, 2009. — 416 с.

10. Путеводитель по основным понятиям и схемам методологии Организации, Руководства и Управления : хрестоматия по работам Г. П. Щедровицкого / Агентство управлен. технологий ; сост. А. П. Зинченко. — М. : Акад. нар. хоз-ва при Правительстве Рос. Федерации ; Дело, 2004. — 207 с.

11. Развитие системы оценки качества образования в Республике Беларусь. Дошкольное образование / А. Л. Давидович [и др.] ; под науч. ред. В. Ф. Русецкого. — Минск : Нац. ин-т образования, 2022. — 248 с.

12. Русецкий, В. Ф. Лингвометодическая система формирования речевой культуры студентов-филологов 1–2 курсов : дис. ... канд. пед. наук : 13.00.02 / В. Ф. Русецкий ; Бел. гос. ун-т, Мин. гос. лингв. ун-т. — Минск, 1994. — 259 л.

13. Тарусова, Л. Г. Оценка качества управленческой деятельности в учреждении дошкольного образования : учеб.-метод. пособие / Л. Г. Тарусова, Т. Л. Маркова ; под общ. ред. канд. пед. наук, доц. Л. Г. Тарусовой ; ГУО «Акад. последиплом. образования». — Минск : АПО, 2021. — 68 с.

14. Третьяков, П. И. Дошкольное образовательное учреждение: управление по результатам / П. И. Третьяков, К. Ю. Белая. — М. : Новая школа, 2001. — 296 с.

15. Труханові́ч, М. Э. Праблема кампетэнтнасці кіраўнікоў устаноў дашкольнай адукацыі па выкарыстанні беларускай мовы ў адукацыйным працэсе / М. Э. Трухановіч // Адукацыя і выхаванне. — 2022. — № 4. — С. 13–22.

16. Шамова, Т. И. Управление образовательными системами : учеб. пособие для студ. вузов / Т. И. Шамова, П. И. Третьяков, Н. П. Капустин ; под ред. Т. И. Шамовой. — М. : Владос, 2001. — 319 с.